# ЗАКАЗНІК «ЕЛЬНЯ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

АПБ

BirdLife IBA
ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК



Чорнаваллёвы гагач
*Gavia arctica* (L.)
Чернозобая гагара
Фатограф: Tomas Lundquist



Гусь-гуменніца
*Anser fabalis* Lath.
Гуменник
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Шызая чайка
*Larus canus* L.
Сизая чайка
Фатограф: Вольга Лукшыц



Кулік-цякун
*Tringa glareola* L.
Фи-фи
Фатограф: Таццяна Раманава



Цецярук (самец)
*Tetrao (Lyrurus) tetrix* (L.)
Тетерев (самец)
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Цецярук (самка)
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Пардва (зіма)
*Lagopus lagopus* (L.)
Белая куропатка (зима)
Фатограф: Knud Pedersen



Пардва (вясна)
*Lagopus lagopus* (L.)
Белая куропатка (весна)
Фатограф: Pasi Parkkinen



Кулік-селянец
*Tringa nebularia* (Gunn.)
Большой улит
Фатограф: Таццяна Раманава



Шэры журавель
*Grus grus* (L.)
Серый журавль
Фатограф: Віктар Казлоўскі



Залацістая сеўка
*Pluvialis apricaria* (L.)
Золотистая ржанка
Фатограф: Johnny Laursen



Сярэдні кулён
*Numenius phaeopus* (L.)
Средний кроншнеп
Фатограф: Finn Carlsen

● Чырвонай кропкай пазначыны віды, занесеныя ў Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь.

Аўтар фота, што з'яўляецца фонам плаката — Вольга Лукшыц.

BirdLife INTERNATIONAL

norden
Nordic Council

Ramsar

**Далучайцеся да руху захавальнікаў ТВП «Балота «Ельня» і зрабіце свой унёсак у яе захаванне!**
**Захавальнікі ТВП — актыўныя аматары прыроды, якія маюць магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, а таксама ўдзельнічаць у прыродаахоўчых мерапрыемствах.**
**Больш інфармацыі пра дзейнасць захавальнікаў ТВП «Балота «Ельня» можна атрымаць у сакратарыяце АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11; e-mail: info@ptushki.org**

Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**

© Edward Zilinsky, 2010

# ЗАКАЗНІК «ЕЛЬНЯ» — ТЭРЫТОРЫЯ, ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

BirdLife IBA ТЭРЫТОРЫЯ ВАЖНАЯ ДЛЯ ПТУШАК

Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Ельня» — найбуйнейшы ў Беларусі комплекс верхавых і пераходных балот, дзе налічваецца больш за 100 азёр. Упершыню балота Ельня было аб'яўлена заказнікам у 1968 годзе, сучасныя межы «Ельні» існуюць з 2007 года, а ахоўваемая плошча складае 25 301 га. Заказнік размешчаны на тэрыторыі Міёрскага і Шаркаўшчынскага раёнаў Віцебскай вобласці.

Балота Ельня — адна з першых мясцін у Беларусі, якая атрымала міжнародны статус аховы: тэрыторыя, важная для птушак (ТВП) і водна-балотная тэрыторыя міжнароднага значэння (Рамсарская тэрыторыя). Тут гняздуюцца птушкі, тыповыя для комплексаў верхавых балот: чорнаваллёвы гагач, пардва, залацістая сеўка, сярэдні кулён, кулік-селянец, сокал-дрымлюк, арол-вужаед і інш. У цэлым на тэрыторыі заказніка сустракаецца 98 відаў птушак, многія з іх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.

Балотны масіў Ельня мае вялікае значэнне як месца прыпынку для мігруючых гусей, качак і журавоў на вясновых і восеньскіх пралётах. У гэты час на вадаёмах можна сустрэць вялікую колькасць гусей-гуменніц, белалобых гусей, качак-свіцьваў, качак-чырак. Асаблівае значэнне тэрыторыя мае для журавоў: праз Ельню мігрыруюць 23 тысячы птушак штогод.






Тэрыторыя, важная для птушак — ТВП (Important Bird Areas — IBA) — прыродная тэрыторыя, якая мае выключную важнасць для захавання рэдкіх і знікаючых відаў птушак, а таксама для падтрымання біялагічнай разнастайнасці ўвогуле.

Праграма вызначэння тэрыторый, важных для птушак (ТВП) у Беларусі выконваецца грамадскай арганізацыяй «Ахова птушак Бацькаўшчыны» (АПБ). АПБ — афіцыйны прадстаўнік міжнароднай асацыяцыі BirdLife International у Беларусі.

Калі Вы неабыякавы да лёсу роднай прыроды, маеце магчымасць наведваць тэрыторыю і кантраляваць яе стан, Вы можаце стаць адным з захавальнікаў ТВП «Балота Ельня».

Каб атрымаць больш інфармацыі пра праграму ТВП і захавальнікаў ТВП «Балота Ельня», звяртайцеся ў сакратарыят АПБ: (017) 263-06-13; факс (017) 265-08-11; e-mail: info@ptushki.org

Дадзенае выданне падрыхтавана пры падтрымцы фонда **Nordic Council of Ministers**.

Аўтар фотаздымка: Віктар Казлоўскі